# СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫЕ НАУКИ

УДК 821.161.3:81’373 (476)

## ЛЕКСЕМЫ СА ЗНАЧЭННЕМ БЕЛАГА КОЛЕРУ Ў ПАЭЗІІ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

**Асіпчук А. М.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Літаратурная спадчына Ларысы Геніюшi сёння не страціла сваёй актуальнасці, з’яўляецца адной з найвялікшых каштоўнасцей у скарбонцы нацыянальнай культуры беларусаў. На жаль, у сілу пэўных аб’ектыўных прычын значная колькасць мастацкіх, публіцыстычных твораў, лістоў нашай славутай зямлячкі не дайшла да чытача. Як слушна заўважае Пётр Марціноўскі, «далёка не ўсё яшчэ вядома і выдадзена, што ёю напісана. Многія вершы згубіліся на старонках замежнага друку, недаступнага нашаму чытачу, і не ўвайшлі ні ў адну з яе кніг, а сотні засталіся ў рукапісах на руках у прыватных асоб» [1].

Аб’ектам нашага невялікага даследавання сталі лексемы са значэннем белага колеру ў вершах і паэмах Ларысы Геніюш. Як паказаў фактычны матэрыял, зафіксаваны наступныя лексічныя адзінкі з гэтым значэннем: *белы, бялявы, бялюсенькі, бялейшы,белізна, бель, бела, бяліць, пабелены, выбеліць, падбяліць*, а таксама двойчы ўжыты дыялектызм *беляхцець* з семантыкай ‘блішчаць беллю, вельмі чыстым’. Акрамя таго, занатаваны складаныя прыметнікі з часткай *белы*: *беласнежны, снежна-белы, белатвары, белагаловы, бела-румяны,* аказіяналізмы *белазоры, беласмертны.* Аўтар ужывае іх як у прамым значэнні (*белы кужаль і бяліць кужаль, белыя палотны, белай яблыні цвет, белы іней, белыя астры, белы бэз, белы тын, пастушок у кашульцы белай, пабялее поле, дым з пабеленых камінoў* і інш.), так і ў пераносным. Менавіта ў пераносным значэнні гэтыя лексемы выступаюць эпітэтамі (*снежна-белы туман, белазоры гай, бела-румяная яблынька, на скронях белым-белы снег* і інш.); уваходзяць у склад метафар (*дзеўка-чаромуха ў белым, выбеліў травень палотны, жыццё скроні даўно пабяліла, Прага ў белы прыбралася іней* і інш.); параўнанняў (*бялейшыя, як снег, курапаткі; бусел, як кужаль, белы; тундра, як белая смерць; святыні побач белыя, як дзіва* і інш.).



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Белы колер у паэзіі Ларысы Генію́ш шматгранны. Найчасцей ён выкарыстоўваецца для стварэння зрокавых малюнкаў зімовага пейзажу. Напрыклад, у вершы «Бывай» наступным чынам падаецца выгляд заснежанай Прагі: *Бывай, дарагая мне Прага!.. Ты ў белы прыбралася іней, калі карабель мой жыццёвы прыстаў на Вэлтаве сіняй. Адвагі было ў мяне мала, настрой – беларускі, гаротны. А ты снегам места прыбрала так белым, як нашы палотны! Ляцелі, як быццам бы зоры, танцуючы з ветрам, сняжынкі, у бель яны строілі горад і цешылі сэрца чужынкі* [2]. Заўважым, што навакольная прыгажосць сугучна пачуццям гераіні: белы снег нагадвае белізну родных палотнаў, а сняжынкі, робячы Прагу святочнай, радуюць сэрца. Яшчэ прыклады зімовых замалёвак, у якіх урачысты, прыўзняты настрой дасягаецца і дзякуючы прыметніку *белы: Каляда, Каляда, на зямлі – Святы Вечар, нарадзіўся ў яслях Збавіцель і Бог. І пасталі бярозаў танклявыя свечкі паабапал заснежаных, белых дарог* [2]; *У снягі, як у белую пену, ветрам збітую ля дарог, уразаліся сані спеўна, летучы пад гасцінны парог* [3] і г. д.

Аднак белы колер амаль вечнай зімы набывае драматычнае гучанне, калі Ларыса Геніюш узгадвае страшныя гады свайго жыцця, якія ёй наканавана было адбыць на *«беласмертнай»* Поўначы. Некалькі прыкладаў (моўныя аўтарскія адметнасці захоўваюцца): *Не спяшу я да вас за помаччу, іскры духа ў вачох блішчаць. Я іду беласмертнай Поўначчу руку смелую вам падаць* [2]; *Цішыня белай смерці навокал, Ледзяная суровая бель. Аніводнай хмаркі высока, што адчайным варожыць мяцель* [2]; *Уставала сонца, як хвост паўліні, над мёртвым снегам тундры бясконцай, дзікім пажарам на небе сінім гарэла сонца. Гарэла сэрца, як Зніч адвечны, у дакор пагрозам белае смерці, сілай і вераю нечалавечай гарэла сэрца!* [2]. Як відаць з вышэйпрыведзеных прыкладаў, аўтарскі неалагізм *«беласмертны»* і словазлучэнні *«белая смерць»* і *«ледзяная суровая бель»* з'яўляюцца сінанімічнымі словам *«мёртвы», «змярцвелы», «пагібельны»*. І поўнай супрацьлегласцю да лютай прыроды таго краю перад чытачом паўстаюць вобразы жанчын з *«беласнежнымі тварамі»*, якія ўспамінаюць родныя мясціны і *«бохан хлеба на белым стале»*, на стале, засланым белым абрусам: *Беларусь! Печ у хаце сялянскай, бохан хлеба на белым стале і жанчын мацярынская ласка да ўсяго, што жыве на зямлі. ... Беларусь, Украіна, Прыбалтыка... Цвет жаночы – Радзіма і Бог. Беласнежныя твары за кратамі, закаханыя сэрцы ў дратох* [2]. У гэтым кантрасце і заключаецца трагізм: жанчына-маці, якая па сваёй існасці ўвасабляе жыццё, выслана на смерць.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Лексемы са значэннем белага колеру выкарыстоўваюцца Ларысай Геніюш і пры паказе вясновай пары: *Бела навокал, аж вочы баляць, вішні лунаюць ля плота, белы ўвесь сад, беляхціць сенажаць, то сонейка беліць палотны* [2]; *Зноў вясны пераможны напеў, беласнежных галінаў у квеці. Да кустоў, да расквечаных дрэў, як дзяцюк, заляцаецца вецер* [3]; *Зелена-зелена, бела-бела. Наша планетка памаладзела. ... Вецер-свавольнік згінае цюльпаны, шэпчацца з яблынькай бела-румянай* [4] і інш. Настрой радкоў аптымістычны, жыццесцвярджальны. Прыгажосць малюнкаў ствараюць слова катэгорыі стану *бела*, прыметнікі *белы, беласнежны, бела-румяны,* дзеясловы *беляхціць і беліць.*

Акрамя таго, белы колер у культуры беларусаў нясе дадатковую сэнсавую нагрузку, увасабляючы сабой чысціню, святло, волю. Белы традыцыйна прысутнічае ў адзенні беларусаў, побыце, гістарычнай сімволіцы, ды і самі беларусы пераважна светлавалосыя, светлавокія. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў паэтычных творах Ларысы Геніюш. Напрыклад, верш «Чысціня» поўнасцю пабудаваны на абыгрыванні лексем са значэннем белага колеру: *Тут белы дзень і белы цвет палотнаў у каморах. У белай світцы белы дзед, а ўнук бялявы поруч. Бярозаў белым-белы стан, ля іх красуня ў белі, звісае белая каса, як белы лён з кудзелі. І белы сыр і белы стол, паважныя, аж люба. Уся сямейка навакол сядзіць ля белай бульбы. Над імі маці са збанком і дочкі, як галубкі. Струменем белым малако паволі льецца ў кубкі. Абраз пад белым ручніком, бялявыя дзяўчаты, і белы бэз, што пад акном, як снег, буслы над хатай. І вішні бела зацвілі, і з белай грывай коні. Чарнелі толькі мазалі рубцамі на далонях* [3]. Неабходна зрабіць агаворку, што антонімы белы – чорны ў гэтым кантэксце не супрацьпастаўляюцца, а злучаюцца, дапаўняюць адзін аднаго: прыгажосць і чысціня, безумоўна, створаны працавітымі, мазольнымі рукамі беларусаў. Яшчэ аналагічныя прыклады: *З беларускай учэпістай гліны і з рабра прынямонскіх вярбін я галінка ля белага тыну незабыўных адвечных святынь* [2]; *Бы ў жнівень сухі, смага мучыць мяне, ўжо няма братніх сэрцаў-крыніцаў. Нават рыцар святы наш на белым кані ў маёй хаце не смее спыніцца* [2]; *Белыя косы, бялявы хлапец каля дзяўчат завіхнуўся, з песняю выйшлі дзень белы сустрэць белыя, белыя, русыя* [2] і інш.

З белым колерам звязана і наша зямля, у назве якой таксама ёсць частка белы. У вершы «Хто?» Ларыса Геніюш параўноўвае Беларусь з белым галубком, які сімвалізуе не толькі святасць, але і шматпакутны лёс краіны: *Крывавіў боль, надзея палымнела, сплывалі слёзы воскам на алтар. О Беларусь, мой галубочак белы ад чысціні нязлічаных ахвяр* [2].



РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ

Кранальна і вельмі шчымліва гучаць гэтыя радкі, што ідуць ад сэрца паэткі.А вось яшчэ адзін метафарычны вобраз Беларусі, які з цеплынёй і замілаваннем паказвае аўтару вершы «Пятру Клімуку»: *То ж Беларусь наша ў хустачцы белай, можа, ў квяцістай святочнымі днямі, узгадаваць свайго сына сумела, – узвіўся арлом з дарагімі сябрамі* [3]. Тут перад чытачом Беларусь паўстае матуляй «у хустачцы белай».

Такім чынам, лексемы са значэннем белага колеру надаюць мастацкую і стылёвую адметнасць творам Ларысы Геніюш, служаць для стварэння трапных, запамінальных вобразаў.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Марціноўскі, П. Наша Лорка: Успаміны і вершы пра Ларысу Геніюш / П. Марціноўскі. – Слонім, 2002. – 56 с.
2. Геніюш, Л. Выбраныя творы / Л. Геніюш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2000. – 616 с.
3. Геніюш, Л. На чабары настоена: Лірыка / Л. Геніюш. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 143 с.
4. Геніюш, Л. Белы сон: Вершы і паэмы / Л. Геніюш. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 351 с.

УДК 821. 161.3

## АСВЕТНІЦКІ СУБСТРАТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ. ПРАЦА У. КАРАТКЕВІЧА НА НІВЕ АСВЕТНІЦТВА

**Банцэвіч П. К.**
УА «Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт»
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Паняцце «Асветніцтва» з'яўляецца трансгістарычнай канцэптуальнай катэгорыяй і ўніверсаліяй культуралогіі, карыснай для рэканструкцыі асобнага шляху беларускай культуры. У якасці адметнай рысы беларускага асветніцтва можна назваць яго прыкладны характар, канкрэтна-практычную дзейнасць па тлумачэнню агульнавядомых, успрынятых іншымі народамі ісцін, якія для Беларусі былі і па-ранейшаму застаюцца надзённымі: абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці, фаміраванне гістарычнага мыслення, выхаванне патрыятызму. Асветніцкія ідэі рэалізоўваліся ў спецыфічных беларускіх умовах у некалькіх культурна-гістарычных мадэлях: асветніцтва як культурная з'ява сярэднявечча, Рэнесансу, класічнае Асветніцтва, сімбіёз асветніцтва і рамантызму і інш. Асветніцтва вызначае сутнасць беларускай культуры, адметнасці развіцця ў сучаснай цывілізацыйнай прасторы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ